Такім чынам, міжпрадметныя сувязі на ўроках беларускай літаратуры ўяўляюць сабою неабходную ўмову арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу як мэтанакіраванай сістэмы. Яны выступаюць як сродак комплекснага падыходу да навучання і ўзмацнення яго адзінства з выхаваннем. У артыкуле разгледжаны толькі некаторыя прыёмы рэалізацыі міжпрадметных сувязяў на матэрыяле творчасці Якуба Коласа. Відавочна галоўнае — гэта праца, калі яна праводзіцца сістэматычна і мае выхад у практычную дзейнасць вучняў, прыводзіць да станоўчых вынікаў.

## Літаратура


1. Вераніцын, К. Тарас на Парнасе: паэмы / К. Вераніцын. — Мінск: Маст. літ., 2009.
2. Гоголь, Н. Мертвые души / Н. Гоголь. — М.: Худож. лит., 1993.
3. Колас, Якуб. Збор твораў: У 14 т. / Якуб Колас. — Мінск: Маст. літ., 1972–1978. — Т. 12.
4. Коменский, Я. А. Избр. пед. соч. / Я. А. Коменский. — М.: Учпедгиз, 1955.
5. Ляшук, В. Я. Вывучэнне ў школе трылогіі Якуба Коласа «На ростанях» / В. Я. Ляшук. — Мінск: Выд. А. Ванін, 1996.


***Віктар Жыбуль***

# Сымон Музыка як сацыяльна-псіхалагічны тып: коласаўскі герой у інтэрпрэтацыі Адама Бабарэкі

Многія творы Адама Бабарэкі напісаны на сумежжы крытыкі з філасофіяй і / або эстэтыкай; закранаюцца ў іх часткова і псіхалагічныя пытанні — напрыклад, праблема ўспрымання навакольнага свету. Гэта датычыць і яго прац, прысвечаных творчасці Якуба Коласа. Калі ў 1927 г. выйшаў артыкул «Паэма “Сымон Музыка” Якуба Коласа», сам народны паэт вельмі станоўча адгукнуўся на публікацыю, зазначыўшы, што А. Бабарэка «цікава пісаў пра паэму» [3, с. 160]. Асабліва шмат увагі крытык прысвяціў аналізу вобраза Сымона Музыкі, які ён разглядаў у

двух вымярэннях, бо ў паэме прысутнічаюць як рамантычны, так і рэалістычны складнікі. З рамантычнага гледзішча *«Сымон Музыка — гэта вобраз беларускага поэты-адраджэнца, які сваю энэргію пясьнярскую аддаваў перад усім на змаганьне за нацыянальную і сацыяльную сьвядомасьць працоўнага люду беларускага, а таму і тварыў адпаведную песьню ды сам праклада́ў ёю "пясьнярскую каляіну" ў жыцьці. Сымон Музыка — гэта вобраз багацьця "сьвежых крыніц" беларускай вёскі, якія гараць жаданьнем вясны, "людзям бліскучай зоркай у іх цемрадзі зазьзяць і сказаць ім, як шчасьліва можна жыць і на зямлі", гараць красою адбітых у іх глыбі зор і "бязьмежжа горных сьветаў", будучы абмяжованы берагамі рэальнага штодзённага клапатлівага жыцьця»* [2, т. 1, с. 366]. Такая трактоўка дала падставы разглядаць вобраз Сымона як алегарычны ў агульным сімвалічна-іншаказальным кантэксце твора, пра што пісаў, напрыклад, Антон Адамовіч [1, с. 536–548, 564–583], а ў наш час — цэлы шэраг іншых даследчыкаў [гл., напр.: 5, с. 15].

Нягледзячы на відавочную алегарычнасць твора, Адам Бабарэка не ўнікае і грунтоўнага разгляду паэмы ў яе інакшым, рэалістычным прачытанні. Рысы рэалізму выяўляюцца тут, сярод іншага, у абмалёўцы індывідуальных рысаў галоўнага героя, вобраз якога з'яўляецца ў заўважнай ступені аўтабіяграфічным. Аўтар звяртаецца да жыццёвай канкрэтыкі, у тым ліку да пəражытага ўласна. І адпаведна, у больш шырокім, наднацыянальным кантэксце Сымон Музыка ўбірае ў сябе рысы мастака, творчага чалавека ўвогуле, незалежна ад яго нацыянальнай прыналежнасці. Крытык прыйшоў да высновы, што выведзены паэтам герой — гэта не проста ўвасабленне самабытнага таленту з народа, а асаблівы псіхалагічны тып чалавека, якому ўласцівыя «тонкая пачуцьцёвая арганізацыя, павыш[аная] здольнасьць чуцьця, усераз[ь]мерная чуласьць», «творчае выбражэньне», «нявінна-дзіцяч[ая] наіўнасьць», «практ[ычная] нецьвярозасьць» і разам з тым — «сконцэнтр[аванасьць] творч[ая]». Такі чалавек «шчыры, просты, не прыкід[ваецца]», ён «жыве бяг[учым] момантам», мае патрэбнасць выказацца, «творыць у час узьнёсласьці», шукае «свабоду духу». Яго творчасць — вобразная і канкрэтная; *«гэта прыродн[ая], праўд[зівая] музыка, адклік[аючаяся] рэхам на "родную зьяву",*

*і, відаць таму ён — "сынтэтык" і "толькі праява і голас мікракосму"»* [2, т. 1, с. 635]. Істотна, што Сымон Музыка выказваецца не дзеля эфекту, які можа выклікаць яго мастацтва, а «**ад паўнаты** душэўнай» [2, т. 1, с. 694].

Адно з ключавых пытанняў, узнятых Якубам Коласам у паэме, А. Бабарэка сфармуляваў як «што такое мастак?». Інтэрпрэтуючы коласаўскую паэму, крытык перадае дадзены Якубам Коласам адказ наступным чынам: *«гэта асоба, перш за ўсё, і асоба з асабліваю псыхічнай арганізацыяй, а ня звычайнаю. Гэта арганізацыя надзвычайна тонкая і празрыстая, дзякуючы чаму яна надзвычайна чулая і здольная рэагаваць на самыя нязначныя і няпрыкметныя зрушэньні зьне яе»* [2, т. 1, с. 367].

Свае назіранні наконт коласаўскай паэмы А. Бабарэка падмацоўвае словамі Анатоля Луначарскага, які зазначаў: «Надо помнить, что художник — это особый тип человека» [2, т. 1, с. 367]. Зразумела, што словы вядомага крытыка-марксіста, наркама асветы гучалі ў той час аўтарытэтна, аднак падобныя думкі пра асаблівасць мастацкай натуры выказвалі і іншыя пісьменнікі, філосафы, псіхолагі, мастацтвазнаўцы розных часоў і народаў — ад Платона і Фамы Аквінскага да непасрэдных сучаснікаў А. Бабарэкі — напрыклад, Зігмунда Фрэйда і Льва Выгоцкага.

Паводле А. Бабарэкі, мастак вылучаецца сярод іншых людзей найперш сваім тыпам светаадчування. Разважаючы пра светаадчуванне ў эстэтычна-літаратуразнаўчым кантэксце, А. Бабарэка зазначаў: *«Адчувальнасьць не ўва ўсіх аднакая. Адны, скажам, здольны адчуваць такія ўласьцівасьці, якія другім зусім не ўспрыймаюцца. Вось выабр[аны] прыклад — зазвычай мы ў сонечным сьвеце ўспрыймаем белы толькі колер і бяз пэўнага апарата зусім ня здольны ўспрыняць яго спэктр. З высока-ж разьвіт[ымі] органамі адчуваньня чалав[ек] успрыймае і адрозьнівае ў белым сьвятле сонца ўсе спэктр[альныя] колеры, яго складаючыя. Вось гэта адчуваньне і выраж[аецца] маст[ацкім] творам, яно вызнач[ае] у першую голаў кірунак творч[асьці]»* [2, т. 1, с. 266–267]. Менавіта такую складаную творчую натуру з тонкай успрымальнасцю і высокаразвітым мастацкім светаадчуваннем уяўляе з сябе Сымон Музыка. На думку крытыка, гэты герой выражае «моц і сілу пачуц[ьцёвай] ар-

ганіз[ацыі], здольнасці адчуваць хараство» [2, т. 1, с. 241]. Ужо ў наш час даследчыкі звярнулі ўвагу на тое, што нават само імя коласаўскага героя — Сымон (Сімяон) — у перакладзе са старажытнаяўрэйскай азначае 'які ўчуў (ці пачуў)' і нібыта намякае на чуйнасць яго натуры, «тонкі, звышнармальны слых», здольнасць пачуць тое, чаго не чуюць іншыя людзі [4, с. 34].

У плане курса лекцый па беларускай літаратуры Адам Бабарэка вылучыў Сымонавы словы *«Усё жыве і душу мае»* як ключавыя для разумення светаадчування героя, а разам з ім — і для разумення ўсёй паэмы. Другім важным пунктам крытык адзначыў сацыяльную значнасць паэмы, звяртаючы ўвагу на «выяўленьне творчых забітых жыцьцём сіл» [2, т. 1, с. 510].

Характэрна, што сутнасць вобраза Сымона Музыкі А. Бабарэка працягваў асэнсоўваць не толькі ў працах, прысвечаных непасрэдна творчасці Якуба Коласа. Напэўна, першым у крытыцы і літаратуразнаўстве А. Бабарэка пачаў выкарыстоўваць імя *Сымон Музыка* як агульнае імя, хадульную назву, пазначэнне пэўнага тыпу чалавека, у індывідуальных рысах і паводзінах якога ўвасоблены якасці, уласцівыя людзям пэўнай эпохі, сацыяльнай і ўзроставай групы, тыпу тэмпераменту і г. д. Сымонамі Музыкамі крытык называе маладых таленавітых і творцаў з народа — тонкіх і высокаадчувальных натур, для якіх асноўнымі ўнутранымі патрэбамі з'яўляюцца духоўная свабода і мастацкая самарэалізацыя. Асабліва часта крытык называе «Сымонам Музыкам (у горадзе)» паэта Язэпа Пушчу, а таксама створанага ім лірычнага героя, і вось чаму. Паводле назіранняў А. Бабарэкі, Якуб Колас, нягледзячы на ўсю адметнасць выведзенага ім персанажа, распавёў пра такога чалавека як пра трэцюю асобу: яго Сымон Музыка *«гаворыць такім-жа стыл[ем], як гавор[ыць] і аўтар пра яго, гаворыць колас[аўскаю] моваю»* [2, т. 1, с. 635], аўтар ім як бы «любуецца збоку» [2, т. 1, с. 624]. А вось творы Язэпа Пушчы, на думку А. Бабарэкі, з'яўляюцца прыкладам таго, як расказаў бы пра сябе сам Сымон Музыка, калі б прыйшоў не ў музыку, але ў літаратуру, — яго мова была б адрознай ад коласаўскай, з яго ўласных вуснаў яго думкі і перажыванні гучалі б па-іншаму.

Гэтую адрознасць А. Бабарэка паказаў на прыкладзе супастаўлення радкоў з паэмы «Сымон Музыка» Якуба Коласа і вер-

ша «Ой ды песні мае цёмнавірыя!» Язэпа Пушчы. Калі першы пра свайго героя пісаў: *«У яго быў сьвет цікавы, // Свае вобразы, жыцьцё, // І ў душы ў яго ўсе зьявы // Сваё мелі адбіцьцё»,* то другі прызнаваўся: *«Хоць я вырас, як сын той сабачы, / Ўсё-ж жыве у грудзёх сакалінае слова»* [2, т. 1, с. 634]. Як бачым, лірычны герой Язэпа Пушчы для сваёй самахарактарыстыкі выкарыстоўвае інакшыя інтанацыі, вобразныя і лексічныя сродкі. Гэтаксама па-іншаму, чым Якуб Колас, Язэп Пушча выяўляе прыгажосць роднага краю. Калі Якуб Колас пачаў *«паказв[аць] гэта хараство ў об'ект[ыўнай] эпічн[ай] тон[альнасьці], але ўсё-ж ён больш аб ім гаварыў, чымся паказваў»*, то Язэп Пушча выводзіў *«малюнкі... у колерах свайго* ***адчуваньня*** [вылучэнне А. Бабарэкі. — *В. Ж.*] *яго (ці пазнаньня, як ён кажа), ахварбаваўшым яго сваімі эмоцыямі (у эмоц[ыйнае] сакалін[ае] слова), расьпісваючы яго словам-вобразам у песьні»* [2, т. 1, с. 746–747].

Вядома ж, творчы светапогляд абумоўліваецца сацыяльнымі абставінамі і жыццёвым вопытам: Язэп Пушча быў песняром маладой інтэлігенцыі, якая на хвалі рэвалюцыйных пераўтварэнняў прыйшла з вёскі ў горад. Таму і Беларусь у яго вершах паўстае не «няшчаснай, забітай і забытай», як у творах ранейшых пісьменнікаў, а «маладой, бунтарскай, свавольнай», якая ідзе ў горад «буяніць» і кажа: «Мы волю сваю абаронім». Тэматычна і вобразна многія яго вершы былі звязаныя з вёскай, з прыродай яе ваколіц, але спосаб выказвання Язэп Пушча абраў для тагачаснай беларускай паэзіі не зусім звычайны — ён свядома абвясціў сябе беларускім імажыністам і напачатку імкнуўся трымацца канонаў гэтага літаратурнага кірунку, звяртаючыся да ўскладненай вобразатворчасці.

Пушчаву паэзію А. Бабарэка называе «поэмай аб днёх вясны мастака, С[ымона] М[узыкі] пасьлярэв[алюцыйнага] часу» [2, т. 1, с. 629], а самога аўтара — «Сым[онам] Музыкам, вышаў[шым] на вольны шлях» і нават «С[ымонам] М[узыкам] на вышэйшай ступені разьвіцьця» [2, т. 1, с. 722]. Адной з галоўных задач сваёй нявыдадзенай манаграфіі «Супроць ветру», прысвечанай творчасці Язэпа Пушчы, А. Бабарэка бачыў раскрыццё вобраза *«рэальнага С[ымона] М[узыкі] у сучасным горадзе, які праходзіць тут розныя кусты рэвалюцыйнага быту па шляху да сьвету і які ўжо сам гаворыць аб сваіх пераржыва-*

*ньнях гэтага падарожжа ў сьвет агульналюдзкай вядомасьці з сьвету нязнанасьці і няпрыкметнасьці, падарожжа сьвету быцьця ў сабе ў сьвет быцьця для сябе»* [2, т. 1, с. 689].

На думку А. Бабарэкі, Язэп Пушча падобны Сымону Музыку ў тым, што *«**прадстаўляе жыцьцё** ў адчувальных вобразах»* і *«пяе тады, калі яго што ўражае, і выказвае ці то радасьць, ці то сум, абуджаны ў ім гэтым уражаньнем»* [2, т. 1, с. 623]. Як і Сымон Музыка, лірычны двайнік Язэпа Пушчы — гэта *«творчы чалавек, адчуваючы красу, украшаючы жыцьцё, гэта "художник", поэт ад прыроды... бел[арус], сел[янін]»* [2, т. 1, с. 675].

Усё вышэйпералічанае сведчыць пра тое, што пэўны тып чалавека А. Бабарэка назваў Сымонам Музыкам не толькі паводле псіхалагічных, але і паводле сацыяльных характарыстык, паводле падабенства да біяграфіі коласаўскага героя, які нарадзіўся ў сялянскай сям'і, рана пакінуў родную хату і, прайшоўшы праз шэраг маральных і фізічных выпрабаванняў, выйшаў «на сваю каляіну», стаў «вольным песняром».

Варта зазначыць, што Якуб Колас у сваёй паэме засяроджвае ўвагу на праблеме генія, не ўспрыманага народам. Адам Бабарэка ж разглядаў Сымона Музыку больш як самадастатковага творцу, носьбіта багатага ўнутранага свету, незалежна ад таго, прымае яго народ ці не прымае. Тым не менш няпростыя рэаліі літаратурнага жыцця другой паловы 1920-х гг. міжволі прымусілі крытыка закрануць і тэму прымання / непрымання: адзін з улюбёных паэтаў А. Бабарэкі Язэп Пушча стаў ахвярай вульгарызатарскіх нападак з боку Т. Глыбоцкага (А. Дудара), Я. Пільнага (З. Жылуновіча), А. Сянкевіча і іншых крытыкаў. На той момант А. Бабарэка яшчэ працягваў ідэалізаваць ролю Кастрычніцкай рэвалюцыі і, адпаведна, усялякія перашкоды для свабоднай рэалізацыі творчасці працягваў асацыяваць найперш з папярэдняй, дарэвалюцыйнай эпохай. Але падзеі ў грамадскім і культурным жыцці БССР прымушалі яго ўсё часцей звяртаць увагу на кантрасты паміж ідэальным і рэальным у савецкім грамадстве. Сацыяльна-псіхалагічная праблема непрымання генія пераносіцца ў А. Бабарэкі на ідэалагічную, звязаную з ваяўнічымі выступленнямі крытыкаў-вульгарызатараў, якія прад'яўляюць творцам абвінавачванні не толькі эстэтычнага, але і палітычнага характару: *«...людзі, прымаючыя ўсё за чыстую*

*манету, людзі, жадаючыя выслужыцца, сьвядома-ж пачынаюць травіць поэта з дня ў дзень, трубячы, як громкагаварыцелі па ўсіх крыжавых дарогах, аб тым, што Пушча сапраўды кулацкі поэта, і таму ў гэтым паходзе не саромяюцца кідаць гразёю і балотам, пляваць у твар аднаму з тых С[ымонаў] М[узыкаў], для якіх Каст[рычніцкая] рэвалю[цыя] дала магчымасьць жыць у шумнай сталіцы, для якіх яна адкрыла магч[ымасьць] сапраўды вольным птахам рэзаць шыр нябёсаў, тварыць поэзію новага жыцьця, тварыць поэзію новае пасьляк[астрычніцкае] эпохі разьвіцьця прац[оўнае] Беларусі, поэзію бел[арускага] пралетар'яту»* [2, т. 1, с. 714].

Цікава, што некаторыя прадстаўнікі айчыннай творчай інтэлігенцыі 1920-х гг. свядома параўноўвалі і атаясамлівалі сябе з коласаўскім персанажам. Так, напрыклад, акцёр і драматург, сябра прэзідыума Калінінскай філіі «Маладняка» Сямён Іванаў (1890 — ?) пад уражаннем паэмы беларускага класіка яшчэ ў 1919 г. абраў сабе творчы псеўданім Сымон Музыка [2, т. 2, с. 718].

Дзякуючы сваёй мастацкай універсальнасці і найперш — створанаму ў ёй адметнаму вобразу галоўнага героя, паэма «Сымон Музыка» цікавіла Адама Бабарэку з гледзішча не толькі ўласна літаратуразнаўства, але і філасофіі, псіхалогіі, эстэтыкі. І артыкул «Паэма "Сымон Музыка" Якуба Коласа», і іншыя працы таленавітага крытыка застаюцца актуальнымі і сёння, бо дапамагаюць зразумець і ацаніць месца і ролю таго ці іншага твора ў літаратурным працэсе. Кажучы словамі самога крытыка, «ёсьць творы, якія твораць гісторыю поэзіі» [2, т. 1, с. 725]. Роля ж паэмы Якуба Коласа «Сымон Музыка» — у тым, што гэта «першы монумэнтальны вершаваны твор у беларускай паэзіі», «адраджэнская нацыянальная поэма творча-мастацкага духу беларускага народу» [2, т. 1, с. 371] і, напэўна, першы ў беларускай літаратуры твор, дзе так грунтоўна і падрабязна раскрыта псіхалогія творчага чалавека, мастака, а таксама прасочаны яго нялёгкі шлях з галечы і цемры да вольнага служэння народу і, адпаведна, прызнання.

**Літаратура**

1. Адамовіч, А. Да гісторыі беларускае літаратуры / А. Адамовіч. — Менск: Выдавец ІП Зьміцер Колас, 2005.
2. Бабарэка, А. Збор твораў. У 2 т. / А. Бабарэка. — Вільня: Ін-т беларусістыкі — Беласток: Бел. гіст. тав-ва, 2011.
3. Лужанін, М. Колас расказвае пра сябе / М. Лужанін. — Мінск: Беларусь, 1964.
4. Машчэнская, Л. Ад назвы да зместу: Паэма Якуба Коласа «Сымон-музыка» / Л. Машчэнская // Роднае слова. — 2004. — № 11. — С. 34–38.
5. Трафімчык, А. Колас прадказаў смерць Мікалая ІІ? / А. Трафімчык // Літаратура і мастацтва. — 2014. — 3 студз.


*Кацярына Ермаковіч*

## Паняцці дабра і зла ў творчасці Якуба Коласа ваеннага перыяду пры вывучэнні аглядавых тэм у Х класе

Вывучэнне творчасці Якуба Коласа ў школе адбываецца на ўсіх ступенях атрымання агульнай сярэдняй адукацыі. Больш грунтоўны аналіз мастацкай спадчыны класіка беларускай літаратуры праводзіцца ў ІХ класе, асаблівасці ж літаратурнага працэсу пэўнага часу, роля і ўплыў на яго развіццё пісьменнікаў разглядаюцца пры вывучэнні аглядавых тэм у Х–ХІ класах. Двойчы вядзецца размова пра значэнне творчасці Якуба Коласа ў гісторыі літаратуры ў Х класе: першы раз — калі характарызуецца беларуская літаратура першай трэці ХХ стагоддзя і другі раз — падчас вызначэння ўмоў існавання беларускай літаратуры ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Відавочна, што асноўная ўвага сканцэнтравана тут на тэме «Чалавек і вайна», г. зн. на тым, што было важным, актуальным, надзённым для тагачаснага грамадства. Спрадвеку для людзей адным з найважнейшых пытанняў з'яўлялася праблема сэнсу чалавечага жыцця, вызначэння, што ёсць дабро, чаму зло ў мірны час становіцца дабром у ваенны (напрыклад, забойства ворага, але такога ж чалавека). Адказы на гэтыя пытанні спрабуе даць мастацкая літаратура.